24 лютага ў рамках тыдня беларускай мовы і літаратуры прайшоў вечар для вучняў старэйшых класаў у форме інтэрактыўнай гульні – віктарыны “Я люблю Беларусь”.

Мэта гульні вызначалася наступным чынам:  паглыблыбіць і абагульніць веды, атрыманыя на ўроках гісторыі і літаратуры; развіваць крытычнае мысленне, фарміраваць камунікатыўную культуру вучняў; выхоўваць любоў і павагу да роднага слова, беларускай літаратурнай, гістарычнай і культурнай спадчыны беларускага народа.

Віктарына складалася з 12 тураў: *“Знакамітыя імёны Беларусі”, “Гарады Беларусі”, “Беларуская літаратура”, “Беларускі фальклор”,“Спорт Беларусі”, “Беларуская мова”, “Прырода Беларусі”, “Беларуская музыка”, “Гісторыя Беларусі”, “Беларускае кіно”, “Мастацтва Беларусі”, “Беларускія фразеалагізмы”.*

На кожным этапе вучні адказвалі на пытанні і выяўлялі свае веды па беларускай мове, літаратуры, міфалогіі, этнаграфіі і фальклоры.

Падчас мерапрыемства гучала беларуская музыка, вершы, былі прапанаваны відэаролікі, якія адлюстроўваюць сучаснае жыццё нашай краіны.

Старшакласнікі з цікавасцю і захапленнем выконвалі прапанавныя заданні.

У канцы гульні былі падвядзены вынікі і ўзнагароджваны пераможцы.
Вядучая звярнулася да ўдзедльнікаў з наступнымі словамі: “Вось і скончылася наша гульня. Спадзяюся, што яна была для вас карыснай і пазнавальнай. Я хачу пажадаць вам толькі аднаго: майце дастаткова амбіцый, каб хацець змяніць свет, зрабіць нашу Беларусь моцнай і квітнеючай. Я ўпэўнена: у вас гэта атрымаецца. У нас створаны  ўсе ўмовы для вас, маладых, для ажыццяўлення ўсіх вашых мар, ідэй і амбіцый. І я ўпэўнена, што вы будзецце старацца прыкласці ўсе сілы і намаганні для таго, каб наша краіна была квітнеючай, мірнай. Сваёй працай вы зробіце Беларусь яшчэ лепшай. Поспехаў!

У заключэнні мерапрыемства прагучала музычная **кампазіцыя “Мая Беларусь”.**


Тыдзень беларускай мовы





